# Інтэрактыўныя метады спазнання кніжнай культуры

**Цікавым асяродкам для папулярызацыі нацыянальнай кніжнай спадчыны сярод дзяцей з'яўляецца Музей кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Пра тое, што чакае там школьнікаў, мы расказалі ў мінулым нумары часопіса. А зараз увазе чытачоў прапануем метадычны артыкул, які прадставіць падыход супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі да правядзення заняткаў з дзецьмі з мэтай далучэння іх да кніжнай культуры. Падрыхтаваны ён загадчыцай сектара навукова-праектнай работы НББ Таццянай Андрэеўнай САПЕГАЙ.**

На занятках, якія праводзяцца ў межах культурна-асветніцкага праекта "У госці да кніг", удзельнікі атрымліваюць новыя веды пра разнастайнасць сусветнай і ўнікальнасць беларускай кніжнай культуры. Адбываецца гэта з выкарыстаннем актыўных і інтэрактыўных метадаў, што дазваляе дзецям адчуваць сябе сапраўднымі ўдзельнікамі сумеснага дзеяння, актыўна камунікаваць з дарослымі і ў групе равеснікаў.

Разгледзім метады, якія эфектыўна дапамагаюць прыцягнуць дзяцей да спазнання кніжнай спадчыны.

**Лекцыя-гутарка**, альбо "дыялог з аўдыторыяй", з'яўляецца найбольш пашыранай формай актыўнага далучэння школьнікаў да працэсу пазнання. Да ўдзелу ў гутарцы дзяцей можна прыцягнуць пытаннямі напачатку і па ходу лекцыі. Пытанні могуць быць як простымі (напрыклад, "Ці ведаеце вы, у якім горадзе нарадзіўся Францыск Скарына?"), так і праблемнымі (напрыклад, "Хто такі наватар? Ці проста быць першапраходцам? У чым наватарства Францыска Скарыны?"). Пытанні дапамагаюць не толькі наладзіць кантакт з аўдыторыяй, разварушыць яе, засяродзіць увагу дзяцей на асобных аспектах тэмы, але і зразумець глыбіню ведаў удзельнікаў, каб адэкватна падаваць матэрыял.

**Абмеркаванне** дазваляе ўдзельнікам групы выказацца, пачуць розныя аргументы, зрабіць аналіз і высновы. Гэты метад базіруецца на пытаннях адкрытага тыпу. Напрыклад, пры абмеркаванні партрэта Францыска Скарыны вядучы пытаецца: "Асоба, адлюстраваная на партрэце, — гэта чалавек з мінулага альбо наш сучаснік? Чаму вы так мяркуеце?". Удзельнікі групы адказваюць на пытанне з прывядзеннем доказаў таго, што гэта гістарычная асоба. Пры гэтым дзеці будуць старанна разглядаць партрэт, каб паўдзельнічаць у сумесным дэтальным яго апісанні. Такім чынам дасягаецца асноўная мэта — запамінанне партрэта першадрукара.

На занятках для размінкі школьнікам прапануецца абмеркаваць такія пытанні: што будзе больш карысным падарункам — кніга альбо кветка? што лепш купіць — кнігу альбо торт? што больш карысна — кніга, камп'ютар альбо тэлевізар? Удзельнікі знаходзяць усе плюсы і мінусы прапанаваных прадметаў, выказваюцца, спрачаюцца і падводзяць вынікі. Трэба адзначыць, што ў гэтых спрэчках кніга заўсёды перамагае, яе карысць прызнаецца большасцю дзяцей і абгрунтавана доказваецца. А пасля такой гарачай размінкі можна і пачытаць, маўляў, "вы, дзеці, самі даказалі карыснасць кнігі".











**Даследаванне** дазваляе не проста паверыць у навуковы факт, а самому паўдзельнічаць у яго адкрыцці для сябе, абапіраючыся на гістарычныя дакументы. Пры вырашэнні пытання, чаму Скарыну ў навуковай, навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры называюць то Францыскам, то Францішкам, школьнікі даследуюць першакрыніцы — самі выданні друкара. Для гэтага на занятках выкарыстоўваюцца факсімільныя выданні [1]. Юныя даследчыкі чытаюць урыўкі, дзе Скарына пісаў звесткі пра сябе і падпісваў сваё імя. У выніку, поўныя гонару, што здолелі чытаць тэксты XVI ст. і ажыццявіць навуковае даследаванне, дзеці асэнсавана запамінаюць вызначаны імі факт.

**Гульня-аналіз** — у ёй дзецям прапануецца вылучыць і разгледзець часткі аб'екта даследавання. На занятках "Структура кодэкса" ўдзельнікі падвяргаюць аналізу кнігу і разбіраюць, з якіх частак яна складаецца. Пры гэтым яны спазнаюць усе складнікі старадрукаванай і сучаснай кнігі, а таксама параўноўваюць іх. У выніку могуць паказаць аправу і вокладку, фарбаваны абрэз і цісненне золатам, тытульны аркуш і форзац, зашпількі і іншыя элементы кнігі. Галоўная мэта заняткаў — прадэманстраваць дзецям, што кніга — гэта не проста прадмет з паперы, а цэлая сістэма, якая складаецца з мноства элементаў і прайшла свой шлях гістарычнага развіцця. Напрыклад, сучаснаму чалавеку цяжка ўявіць, што тытульны аркуш кнігі існаваў не заўсёды. У Еўропе ён з'явіўся ў другой палове XV ст., а ў канцы XVI ст. ужо цяжка было знайсці выданне без тытульнага аркуша. Да з'яўлення гэтага элемента кнігі яго сэнсавую ролю выконваў калафон — тэкст на апошняй старонцы кнігі, у якім паведамляліся звесткі пра аўтара, час і месца яе стварэння. Для ўдзельнікаў заняткаў таксама новай з'яўляецца інфармацыя, што еўрапейская друкаваная кніга спачатку не ведала выдавецкай аправы і паступала ў продаж без яе, а пакупнік сам замаўляў аправу ў спецыяльных майстэрнях.

**Гульня-асацыяцыя** развівае асацыятыўнае мысленне, здольнасць будаваць лагічныя ланцужкі, узбагачае слоўнікавы запас. Можа быць рознай ступені складанасці і рознаварыянтнай у залежнасці ад узросту дзяцей. Самы просты спосаб яе правядзення — знайсці асацыяцыі да слова "кніга". Дзеці могуць іх агучваць альбо запісваць, а пасля вядучы арганізуе абмеркаванне. Практыкуецца і такі, больш складаны, варыянт: падбіраем тры асацыяцыі да імя Францыск Скарына, затым асацыяцыі да папярэдніх асацыяцый і так далей па ланцужку. На пятай асацыяцыі спыняемся і назіраем, ці асацыіруюцца словы, да якіх прыйшлі, з першадрукаром. Можна прапанаваць скласці сказы з ужываннем апошніх асацыяцый, якія б характарызавалі Скарыну.

**Ролевая гульня** — гэта канструяванне, разыгрыванне ўдзельнікамі групы сцэнкі з загадзя размеркаванымі ролямі. Так, на занятках "Рукапісная кніга" ўдзельнікі дазнаюцца пра формы, матэрыялы, мастацкае афармленне рукапіснай кнігі і спрабуюць сябе ў ролі перапісчыкаў.

Заняткі "Францыск Скарына" завяршаюцца прэс-канферэнцыяй. Вядучы просіць аднаго з удзельнікаў пабыць у ролі "эксперта" ("прафесара-скарыназнаўцы"), астатніх — уявіць сябе прадстаўнікамі прэсы, сфармуляваць пытанні і задаць іх "эксперту". Неабходнасць прыдумваць пытанне па тэме актывізуе разумовую дзейнасць, а чаканне адказу на сваё пытанне канцэнтруе ўвагу слухачоў. "Эксперт" мае магчымасць праявіць

свае інтэлектуальныя і творчыя здольнасці. У выніку адбываецца ненавязлівае паўтарэнне і засвойванне тэмы ўсёй групай.

На занятках “Быць бібліятэкарам і музейнікам — не сумна” дзецям прапануецца паглядзець на бібліятэку і музей не толькі вачыма карыстальнікаў і наведвальнікаў. Падчас заняткаў яны становяцца бібліятэкарамі і ажыццяўляюць пошук дакументаў у электронным каталогу, спрабуюць адшукаць кнігу ў фондзе і абслужыць карыстальніка. У музеі ўдзельнікам заняткаў прапануюцца сітуацыі, калі яны могуць паспрабаваць сябе ў якасці музейнага наглядчыка, навуковага супрацоўніка і экспазіцыянера. У канцы заняткаў дзеці ўжо свядома параўноўваюць арганізацыю працы ў бібліятэцы і музеі, выдзяляюць асноўныя службовыя абавязкі супрацоўнікаў, пералічваюць неабходныя прафесійныя якасці.

**Гульня-пантаміма** не толькі паляпшае настрой групы, аб’ядноўвае яе, але і развівае невербальнае мысленне. Яна можа ўжывацца ў пачатку, сярэдзіне альбо ў канцы заняткаў.

У пачатку заняткаў гульня выкарыстоўваецца ў якасці размінкі — лёгкага ў псіхалагічным плане практыкавання, закліканага згуртаваць групу, крыху “разагрэць”, разварушыць яе эмацыйную сферу. Напрыклад, паказаць Францыска Скарыну без слоў. Каб паспяхова выканаць такое заданне, трэба даволі няблага валодаць творчай фантазіяй, уласным целам.

У сярэдзіне заняткаў гульню-пантаміму можна выкарыстаць як хвілінку адпачынку. Напрыклад, падчас заняткаў “Формы і матэрыялы кнігі” пры расказе пра кнігі старажытнай Індыі аднаму з удзельнікаў вядучы называе дрэва, лісце якога выкарыстоўвалася ў якасці матэрыялу для стварэння кніг, і прапануе паказаць яго. Астатнія адгадваюць пальму. Такі момант эмацыйнай разрадкі адначасова дазволіць дзецям дакладна запомніць адзін з фактаў гісторыі кнігі.

У завяршэнні заняткаў гульня-пантаміма можа стаць тым пазітыўным момантам, які дазволіць прыемна развітацца і захаваць жаданне вярнуцца ў бібліятэку зноў.

**Тэатральная імправізацыя** спрыяе збліжэнню дзяцей, раскрыццю іх творчых здольнасцей, набліжэнню да ведаў не толькі праз розум, а і праз пачуцці і эмоцыі.

Аднойчы ў “Клубе кніжных прафесараў” тэма “Рукапісная кніга” пачалася з абмеркавання ўражанняў ад спектакля “Крышталёвы туфлік”, прэм’еру якога ўдзельнікі паглядзелі разам у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Асаблівую ўвагу юныя кнігазнаўцы звярнулі на Радцу, які выходзіў на сцэну з пяром і скруткам. Юныя “прафесары” ўжо асэнсавана ўспрынялі значэнне гэтых прадметаў, якія належаць да рукапіснай кніжнай культуры. У Музеі кнігі дзеці наладзілі сваю тэатральную пастаноўку, у якой таксама была рукапісная кніга. Вядучы заняткаў чытаў тэкст, а дзеці разам з бацькамі імправізавалі.

**Работа ў малых групах** дапамагае ўцягнуць у актыўную работу ўсіх удзельнікаў, асабліва тых, хто ў вялікай групе заставаўся пасіўным. Яна завяршаецца прэзентацыяй калектыўнай работы і абмеркаваннем яе вынікаў.

На занятках праекта “У госці да кніг” дзеці ў малых групах працуюць даволі часта:

- ствараюць дызайнерскі партрэт Францыска Скарыны, калі ім прапануецца колерам выдзеліць найбольш важныя элементы на малюнку і абгрунтаваць, чаму менавіта яны былі выбраны для перадачы зместу;














- складаюць з разрозненых слоў сказы з твораў першадрукара і абмяркоўваюць іх змест;
- збіраюць з пазлаў партрэт Скарыны альбо тытульны аркуш кніг першадрукара, выяву ініцыяла і інш.

**Творчыя заданні** дазваляюць праявіць індывідуальныя здольнасці, замацаваць тэарэтычную частку заняткаў і творча паглядзець на аб'ект пазнання. На занятках практыкуюцца наступныя творчыя заданні:

- ✔ падпісанне паштовак;
- ✔ размалёўкі;
- ✔ маляванне;
- ✔ сварэнне прадмета і інш.

Заняткі "Посткросінг з Францыскам Скарынай" пачынаюцца са знаёмства з паштоўкамі, якія былі выдадзены НББ ў серыі "Мастацкая Скарыніяна". Прэзентуюцца камплекты паштовак, адзін з якіх уключае рэпрадукцыі твораў знакамітага беларускага мастака і этнографа Язэпа Драздовіча, прысвечаных асобе першадрукара. Другі — рэпрадукцыі твораў вядомага айчыннага мастака Мікалая Байрачнага, падрыхтаваных адмыслова для выдання А. Клышкі "Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга". Праз серыю мастацкіх работ у яркіх вобразах ілюструецца распавед пра жыццё і творчую дзейнасць славутага беларускага асветніка. У завяршэнне дзеці падпісваюць паштоўкі з выявамі першадрукара знаёмым і сябрам.

Размалёўкі ўяўляюць сабой займальны працэс пераўтварэння чорна-белых вобразаў у каляровыя. Пасля творчага працэсу выява становіцца яркай і вясёлай. Гэта заданне выкарыстоўваецца на занятках "Ёган Гутэнберг", "Францыск Скарына" і інш. У завяршэнні аднаго з заняткаў серыі "Музейныя чытанні" дзецям прапануецца размаляваць чалавечкаў, якія трымаюць кнігі, і напісаць назвы гэтых кніг: адна з іх — прачытаная на занятках, другая — любімая.

Удзельнікі заняткаў "Рукапісная кніга" маюць магчымасць уключыцца ў творчы працэс і стварыць сваю ўнікальную буквіцу. Дзеці самі малююць першую літару і такім чынам становяцца актыўнымі прадаўжальнікамі рукапіснай традыцыі.

На заятках "Формы і матэрыялы кнігі" школьнікі ствараюць "бамбукавыя скруткі" сваімі рукамі, выкарыстоўваючы кардон альбо палачкі для марожанага і ніткі.

На занятках "Папяровыя цуды" ў якасці творчага задання дзецям прапануецца зрабіць сваімі рукамі мініяцюрную кнігу.

Унікальнасць заняткаў у Музеі кнігі НББ заключаецца ў магчымасці вывучэння нацыянальнай кніжнай спадчыны праз багаты збор кніжных помнікаў бібліятэкі. Пры ўсёй разнастайнасці метадаў асноўным сродкам уздзеяння на дзяцей, крыніцай эмацыянальнай рэакцыі ў бібліятэцы застаецца сама кніга. Заняткі праводзяцца сярод арыгінальных кніжных помнікаў, якія экспануюцца ў музеі. Істотным у пазнавальным працэсе з'яўляецца "непасрэдны кантакт" з аўтэнтычнымі прадметамі і магчымасць асабістага назірання.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Кніжная спадчына Францыска Скарыны = Книжное наследие Франциска Скорины = Book heritage of Francysk Skaryna : да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; аўт. ідэі : Р. С. Матульскі, П. У. Калаур ; адк. рэд. А. А. Суша ; пер. на анг.: Г. М. Каваленка, І. В. Ісаева ; літ. пер. прадмоў Ф. Скарыны на сучас. беларус. і рус. мовы А. У. Бразгунова [Факсіміл. ўзнаўленне]. — Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2013—2017.